# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 21 (808) | Серада, 12 чэрвеня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

## У ПАРТКОМЕ

На пасяджэнні парткома універсітэта, якое адбылося на мінулым тыдні, разгледжаны пытанні: аб авангарднай ролі камуністаў вучэбнага аддзела ў вывучэнні, абагульненні і распаўсюджванні перадавога вопыту кафедр і факультэтаў; партыйныя арганізацыі факультэтаў і новы набор; аб стане і мерах па паляпшэнню фізкультурна-масавай работы ва універсітэце і задачах партыйных арганізацый.

Партком прыняў да ведама і адобрыў дзейнасць камуністаў: начальніка вучэбнага аддзела Н. І. Папковай і загадчыцы практыкі Ю. Д. Алейнік. У сваім рашэнні ён зазначыў, што ў перыяд перабудовы і далейшага ўдасканальвання сістэмы вышэйшай адукацыі камуністы Папкова і Алейнік прыкладаюць намаганні для ўдасканальвання планіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу, пошуку новых форм справаздачнасці і кантролю за ведамі студэнтаў, работай прафесарска-выкладчыцкага і дапаможнага саставу. Адзначана, што для паляпшэння вучэбнай работы вучэбны аддзел павінен больш актыўна выкарыстоўваць у новым навучальным годзе такія формы работы як Дні кафедр і факультэтаў, абмен опытам работы сярод выкладыкаў і студэнтаў, шырокае асятленне яго на старонках шматтыражнай газеты, шырэй прыцягваць да работы і абапірацца на вучэбна-метадычны савет універсітэта, накіраваўшы яго на вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне перадавога вопыту кафедр і факультэтаў.

Па другому і трэцяму пытаннях, пасля выступлення камуністаў: прарэктара па вучэбнай рабоце М. В. Селькіна, старшыні спартклуба Д. М. Жаркова і загадчыка кафедры фізічнага выхавання В. А. Каляды. партком вызначыў месца ролю партыйных арганізацый факультэтаў у правядзенні прафарыентацыі і прапагандзе універсітэцкіх спецыяльнасцей, традыцый ГДУ сярод навучэнцаў, насельніцтва горада і вобласці, правядзенні новага набору, у развіцці фізкультурна-масавай і аздараўленчай работы сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў.

Партком звяртаецца да Гомельскага абласнога і гарадскога камітэтаў КПБ, савецкіх органаў з просьбай аб рашэнні пытання па паляпшэнню і развіццю вучэбна-вытворчай і спартыўнай базы універсітэта.

## І ЗНОЎ ЭКЗАМЕНЫ, ЭКЗАМЕНЫ...

Чэрвень, хоць сёлета і не вызначаецца высокай тэмпературай, для студэнтаў самы гарачы і хвалюючы месяц. На ўсіх факультэтах нашага універсітэта ідзе залікова-экзаменацыйная перавадная сесія. Яна падсумуе вынікі набытых будучымі спецыялістамі ведаў не толькі на другі семестр, але і за ўвесь навучальны год. Для адных, хто пастаянна і старанна працаваў з кнігамі і канспектамі, яна прынясе радасць, а для тых, хто ленаваўся, ухаластую траціў час, — засмучэнне.

Карэспандэнт нашай газеты пацікавіўся вынікамі сесіі ў дэкана геалагічнага факультэта А. П. Пінчука. Адам Пятровіч выказаў задавальненне. Справа ў тым, што на геафаку ў апошні час сталі больш патрабавальнымі да студэнтаў. Пасля зімовай сесіі адлічылі каля 20 студэнтаў, якія ленаваліся вучыцца, своечасова не ліквідавалі акадэмічную запазычанасць. Гэта стала сапраўды павучальным урокам. Сваю ролю адыграла і тое, што ў цяперашні час суцэльнай дарагавізны нельга застацца без стыпендыі. Без яе не пражывеш.

На геафаку першымі здалі сесію трэцякурснікі спецыяльнасці «Геафізіка». Усе яны адправіліся на практыку, не маючы ніводнай нездавальняючай адзнакі. Такі факт, бадай, першы ў гісторыі геафака.



**Глыбокія веды дае студэнтам біяфака загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін прафесар А. І. Кіеня. Гэта выяўляецца на экзаменах, дзе Аляксандр Іванавіч вызначаецца патрабавальнасцю. Аднак большасць студэнтаў атрымоўвае ў яго добрыя і выдатныя адзнакі. На «выдатна» адказала на пытанні білета па фізіялогіі чалавека і студэнтка групы Б-33 Аляксандра Ракуцька.**

Фота У. Чысціка.



## МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС БЕЛАРУСІСТАЎ

25—27 мая 1991 года ў Мінску праходзіў ўстановачны кангрэс Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Стварэнне гэтай асацыяцыі, яе дзейнасць — заканамерная з'ява ў культурным жыцці нашай рэспублікі і краіны: адраджэнне духоўнасці, асэнсаванне мінулага, пошук шляхоў выйсця з цяжкага і заганнага становішча, у якім аказаўся беларускі народ, патрабуюць намагання многіх вучоных, пісьменнікаў, дзеячоў культуры.

У рабоце кангрэсу прынялі ўдзел і супрацоўнікі нашага універсітэта: загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка, загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт І. Ф. Штэйнер, а таксама аўтар гэтых радкоў. Абодва названыя ўдзельнікі паспяхова выступілі з дакладамі на секцыйных пасяджэннях, прысвечаных актуальным пытанням беларускай мовы і літаратуры.

Удзельнікаў кангрэсу ў першы дзень яго работы віталі намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР С. Шушкевіч, народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, прэзідэнт АН БССР Ул. Платонаў, міністр замежных спраў нашай рэспублікі П. Краўчанка. Сярод замежных гасцей, якія выступілі з дакладамі і паведамленнямі на пленарным пасяджэнні, быў і старшыня Англа-Беларускага таварыства Джым Дзінглі з Лондана, які нядаўна наведаў наш універсітэт.

Бадай, галоўнае ўражанне, якое пакінуў кангрэс (а падстаў для іх было шмат), — гэта захапленне і пачуццё вялікай удзячнасці да прадстаўнікоў розных краін свету — ЗША, ФРГ, Італіі, Індыі, Швейцарыі, Японіі, Англіі, Польшчы, Аўстрыі, Балгарыі, Югаславіі і многіх іншых), — якія не толькі цудоўна валодаюць беларускай мовай, але і займаюцца вывучэннем, даследаваннем розных праблем беларускай мовы, літаратуры, культуры і гісторыі. Удзельнікі кангрэсу выказаліся за далейшае развіццё беларусістыкі ў нашай краіне і па-за яе межамі, за ўмацаванне сувязей паміж усімі, каму не абыякавы лёс роднай мовы і культуры.

У. КОВАЛЬ,
загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

## ПА ПЫТАННЯХ АПЛАТЫ ПРАЦЫ

З 1 красавіка г. г. павышаецца заработная аплата працы работнікам вышэйшай школы. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу нашага універсітэта яна ўжо вядомая. Аб яе памерах мы паведамляем і ў сённяшнім нумары газеты.

Што ж датычыць вучэбна-дапаможнага персаналу і работнікаў АГЧ, яны пакуль што не мелі ніякай яснасці, а таму ўзнікала шмат пытанняў, з якімі людзі звярталіся не толькі ў прафсаюзны камітэт, але і ў рэдакцыю нашай газеты. Для таго, каб не было крыватолкаў і сумненняў, у мінулы чацвер прафком правёў нараду вучэбна-дапаможнага персаналу і работнікаў АГЧ па пытаннях павышэння заработнай платы. На пастаўленыя пытанні вычарпальныя адказы давалі прарэктар А. П. Кармазін, галоўны бухгалтар І. А. Курава, юрысконсульт В. М. Рупін. Пералічаных на рахунак універсітэта сродкаў, па папярэдніх падліках, хопіць, каб павысіць існуючыя аклады і стаўкі, без уліку кампенсацый і індэксацый, не менш, чым на 40%. Пераразлік і выплата сум будзе зроблена да 2 ліпеня.

На нарадзе з інфармацыяй аб праводзімай рабоце па арганізацыі аздараўлення членаў прафсаюза і іх дзяцей выступіў старшыня прафкома Г. І. Варатніцкі.

| | пасад. аклады | надбаўка | зарплата |
|---|---|---|---|
| Выкладчык, асістэнт (без ступені) | 320 | 60 | 380 |
| Выкладчык, асістэнт (кандыдат навук) | 370 | 60 | 430 |
| Старшы выкладчык (без ступені) | 400 | 90 | 490 |
| Старшы выкладчык (кандыдат навук) | 450 | 90 | 540 |
| Дацэнт (кандыдат навук, які мае званне дацэнта) | 500 | 130 | 630 |
| Прафесар (доктар навук) | 650 | 230 | 880 |
| Прафесар (які не мае вучонай ступені доктара навук) | 580 | 230 | 810 |
| Загадчык кафедры (дацэнт, ст. выкладчык) | зарплата па пасадзе +100 руб. за загадванне кафедрай | | |
| Загадчык кафедры (прафесар, які мае вучоную ступень доктара навук) | 700 | 230 | 930 |
| Загадчык кафедры (прафесар, які не мае вучонай ступені доктара навук) | 650 | 230 | 880 |
| Дэкан | зарплата па пасадзе 160+20=180 | | |
| Намеснік дэкана | — 130+20=150 | | |

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць загадчыка кафедры ГА і медпадрыхтоўкі доктара медыцынскіх навук ДЗЯДЗІЧКІНА Валерыя Паўлавіча з прысваеннем яму Дзяржкамадукацыяй СССР вучонага звання прафесар.



Парк культуры і адпачынку імя Луначарскага вабіць сваёй прыгажосцю не толькі гамяльчан, але і гасцей горада.

Фота І. Чысціка.

*У ВНУ краіны*

## НЕТРАДЫЦЫЙНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Факультэт аздараўленчай фізкультуры арганізавалі ў Днепрапятроўскім інстытуце фізкультуры. Ён будзе рыхтаваць спецыялістаў, якія спатрэбяцца людзям з рознымі фізічнымі недахопамі, інвалідам. Вучэбная праграма факультэта — унікальная. Тут будуць вывучаць і нетрадыцыйныя метады лячэння: ёгу, аўтатрэнінг, дыхальную гімнастыку, лячэнне голадам, народную медыцыну. Лекцыі будуць чытаць не толькі спецыялісты інстытута, але і іншых ВНУ горада, нават свяшчэннікі.

## «З'ЕЛІ» РЭКТАРА МВТУ

Пасля прызначэння рэктарам МВТУ імя Баумана лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, доктар тэхнічных навук А. Елісееў энергічна узяўся за перабудову ВНУ. Ён дабіўся яе пераўтварэння ў тэхнічны універсітэт, здолеў арганізаваць выданне вузаўскага часопіса, планаваў арганізаваць навучанне на базе сучаснай навукі, стварыць шэраг НДІ. Але смелага рэфарматара «з'елі» уласныя калегі. Падтрымліваючы пераўтварэнні на словах, 169 з 273 членаў савета ВНУ прагаласавалі супраць працягу паўнамоцтваў рэктара на наступны пяцігадовы тэрмін.

## ПРАЦЫ СТАЛІНА ЯШЧЭ ПАПУЛЯРНЫЯ

Некаторыя універсітэцкія бібліятэкі Расіі пачалі прадаваць свае фонды. На распродажы кніг у навуковай бібліятэцы Томскага універсітэта асаблівым попытам карысталіся творы Сталіна. Яго працы, якія каштавалі ў год выдання 20 капеек, прадаваліся за 5—10 рублёў. «Цаліну» Брэжнева куплялі за 8 рублёў.

*Пра этыкет*

# КВЕТКІ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ

**Тлумачэнне кветак у адносінах да чалавечых зносін з часам настолькі пашырылася, што з'явілася нават так званая «мова кветак».**

Прыслухацца да «мовы кветак» трэба кожнаму, асабліва дзяўчатам. Ведаючы значэнне кветак, яны не ўпрыгожаць сябе ярка-чырвонай ружай або гваздзіком — сімвалам вогненнага пачуцця, а маладыя людзі павінны задумацца, перш чым падабраць букет для дзяўчыны, маці або бабулі.

Трэба адзначыць, што кветкі лепш за візітную картку могуць прадставіць чалавека, які дорыць іх, паказаць узровень яго выхаванасці, густ, адносіны да таго, каму яны прызначаюцца. І не толькі падборам і якасцю саміх кветак, а тым, як гэтыя кветкі ўручаюцца.

Калі перад сустракаючымі вас маладымі мужам і жонкай вы дастанеце кветкі з гаспадарчай сумкі або партфеля і пададзіце іх у паперы, ды яшчэ сцеблямі ўверх, — гэта будзе яркім сведчаннем значных прабелаў у вашым выхаванні.

Кветкі трэба разгарнуць у прыхожай, узяць у левую руку, пакінуўшы правую свабоднай для прывітання. Павіншаваўшы юбіляра і ўручыўшы яму падарунак, кветкі трэба прыпаднесці толькі гаспадыні, незалежна ад таго, хто ў доме юбіляр. Гаспадыня ж дома—юбіляру—уручаюць і падарунак, і кветкі. Так жа трэба паступіць і ў рэстаране, калі вас сустракае юбіляр разам з жонкай.

Гаспадыня дома, у сваю чаргу, абавязана падзякаваць за кветкі і паставіць іх у вазу ў тым пакоі, дзе прымаюцца госці. Выносіць толькі што падараваныя кветкі ў іншыя пакоі не прынята, калі нават кветак у гэты вечар занадта многа. На стол трэба ставіць толькі тыя з іх, якія падыходзяць да агульнай кампазіцыі накрытага стала і адпавядаюць адзначаемай падзеі.

Калі адзначаецца юбілей дзяўчыны, стол трэба ўпрыгожыць яшчэ не разгарнуўшыміся бутонамі руж бледна-ружовых таноў. Вазу трэба падабраць больш сучаснай формы. Ранняй вясной гэта могуць быць таксама першыя палявыя кветкі. Прыгожа скампанаваныя ландышы, фіялкі або ранні бэз (у невялікай колькасці, таму што бэз мае рэзкі пах) упрыгожаць вясной стол не горш за дарагіх і пышных руж. Букет можна скласці з такой колькасці руж, колькі гадоў юбіляру. Калі сцяблы руж вельмі доўгія (цяпер гэта модна), то такі букет лепш размясціць на краю стала, каб ён не засланяў твары гасцей, а па цэнтры паставіць больш нізкія кветкі

На банкеце ў гонар жанчыны сярэдніх гадоў стол перш за ўсё трэба ўпрыгожыць яе любімымі кветкамі (аб гэтым трэба ведаць загадзя). Можна таксама скласці букеты з жоўтых і ружовых гваздзікоў, гербер, руж. Вазы лепш усяго ўзяць каляровыя, хрустальныя або мастацкія керамічныя. Вышыня вазы не павінна перавышаць палавіны вышыні букета.

На банкеце ў гонар пажылой жанчыны стол можна ўпрыгожваць распусціўшыміся чырвонымі ружамі (іх любяць усе), буйнымі гваздзікамі, хрызантэмамі, лілеямі. Букеты трэба дапаўняць масіўным лісцем іншых кветак або раслін. Вазы ў такіх выпадках трэба падбіраць старынныя хрустальныя або з фарфору з малюнкам ручной работы. На стол можна паставіць адзін або два такіх букеты, а таксама свечкі ў кандэлябрах. Перагрузка стала кветкамі і іншымі ўпрыгожваннямі не падкрэслівае ўрачыстасці моманту. Калі кветак шмат, іх трэба расставіць па пакоі, дзе накрыты стол, карыстаючыся падлогавымі вазамі.

Больш складанае ўпрыгожванне кветкамі вясельнага стала. Як ні дзіўна, але цяжкасць заключаецца ў выбары кветак, таму што іх заўсёды занадта многа і ўсе добрыя. Па-першае, перавага аддаецца букету нявесты. Гэта букет белых або лёгка ружовых кветак. Цяпер большасць жаніхоў у знак гарачага кахання дораць нявестам у дзень вяселля чырвоныя ружы. Як бы там ні было, кветкі нявесты ставяць перад маладымі, перад вясельным тартом. Яшчэ некалькі невысокіх букетаў ставяць па дыяганалі стала. Калі букет нявесты ўпрыгожан карункавымі лентамі або каляровым цюлем, гэтыя ўпрыгожванні захоўваюцца, толькі букеты з такімі ўпрыгожваннямі трэба размяшчаць так, каб карункі не замоклі ў вадзе. Пасля вяселля нявеста ставіць букет у сваёй спальні. Калі кветак вельмі многа, то букеты трэба расставіць не толькі ў тым пакоі, дзе накрыты стол, але і там, дзе танцы і гульні. Добра гарманіруюць на вясельным стале кветкі ў арыгінальных вазах і свечкі ў кандэлябрах.

Зараз модна размяшчаць складаныя кветкава-дэкаратыўныя кампазіцыі ў стылі ікэбанка на этажэрках, паліцах, сервантах. Класічныя кампазіцыі з кветак, лісцяў, кары дрэваў, сцеблаў травы, сухіх галін не толькі радуюць вока, але і дастаўляюць глыбокае эстэтычнае задавальненне.

## ДЛЯ ТЫХ, ХТО ХОЧА АВАЛОДАЦЬ МОВАЙ ЭСПЕРАНТА

Уфімскія завочныя курсы эсперанта пад кіраўніцтвам кандыдата філалагічных навук Б. Р. Колкера:

— курсы зарэгістраваны ў адпаведнасці з законам;

— нізкая плата за навучанне;

— высокі ўзровень навучання пад кіраўніцтвам аўтара трох падручнікаў эсперанта;

— без дадатковай аплаты падручнік эсперанта з аўтографам яго аўтара;

— дапамога ў набыцці эсперанцкай літаратуры:

— па заканчэнні курсаў — атэстат і падрабязная інфармацыя, якая дазваляе хутка знайсці сябе ў эсперанцкім свеце:

— бясплатныя кансультацыі па ўсіх пытаннях мовы эсперанта і эсперанта-руху ў працэсе навучання і пасля заканчэння курсаў.

Узроўні: пачатковы курс і асноўны курс.

У перспектыве: павышаны курс і педагагічны курс.

Адрас: 450000 Уфа-цэнтр, а/я 1125, Уфімскі клуб эсперанта, Колкер Барыс Рыгоравіч.

*Тэатральная афіша*

## У РЭПЕРТУАРЫ—ВОСЕМ СПЕКТАКЛЯЎ

У нас ва універсітэце нямала аматараў тэатральнага мастацтва. Яны не ўпускаюць магчымасці пазнаёміцца з творчасцю тэатральных калектываў краіны, якія прыязджаюць на летнія гастролі ў г. Гомель. На гэты раз у горад над Сожам прыехаў Краснадарскі тэатр драмы.

«Гамлет» — адна з нядаўніх работ тэатра. Яе калектыў прапаноўвае сваю, у многім нечаканую, як па зместу, так і па мастацкаму рашэнню інтэрпрэтацыю твора Шэкспіра.

Захапляючы сюжэт, неапалітанскія мелодыі і многае іншае, што дорыць гледачам мінуты вясёлага адпачынку, — усё гэта вы знойдзеце ў фарсе па-італьянску «Суцяшальнік удоў».

«Звер» ленінградскіх драматургаў В. Сінкевіча і М. Гіндзіна — фантастычная драма. Невядома, як называецца голая, знішчаная сусветнымі катаклізмамі планета. Няма імёнаў і ў герояў — проста Бацька, Маці, Дачка... Цудам уцалелыя, яны блукаюць у пошуках сабе падобных, сустракаючы спачатку Звера, а потым Сябра. Сітуацыі п'есы, то драматычныя, то забаўныя.

«Калі прачнецца той, хто спіць» — таксама фарс, але фарс па-савецку. Гэта даволі смешная гісторыя аб персанажах, якія жывуць плоцкім жыццём без Бога ў душы.

Нешта падобнае адбываецца на сцэне і ў спектаклі «Забавы пасля апоўначы» па п'есе вядомага драматурга і сцэнарыста В. Мярэжкі. Анекдатычны сюжэт бліжэй да фіналу прыводзіць героя да нежартоўных душэўных узрушэнняў.

«Завядзенне Зойкі Пельц» М. А. Булгакава — прэм'ерны спектакль тэатра. Артысты стварылі сваю рэдакцыю з двух варыянтаў вядомай п'есы «Зойкіна кватэра».

«Пастка» французскага драматурга Р. Тома — дэтэктыў, і гэтым, бадай, усё сказана. Застаецца дадаць, што дэтэктыўная фабула афарбавана аўтарам і тэатрам у камедыйныя колеры.

Смешную гісторыю з серыі так званых «чорных камедый» пад назвай «Каханне да гроба» прыдумаў бліскучы італьянскі камедыёграф А. Нікалаі. Тэатр вызначыў жанр спектакля як «камедыю жахаў».

Знайдзіце час, пaглядзіце спектаклі, якія прапануюць артысты з Краснадара. Гастролі працягнуцца да 30 чэрвеня.

*Спорт*

## СПАРТАКІЯДНАЕ СЕРАБРО

У Магілёве завяршыліся спаборніцтвы па баскетболу сярод мужчынскіх каманд па праграме X спартакіяды БССР.

У першых чатырох гульнях баскетбалісты нашай вобласці перамаглі адпаведна каманды Мінскай вобласці — 104:54, Гродзенскай — 87:65, Брэсцкай — 98:68 і Магілёўскай — 96:88.

Заключная сустрэча з камандай Мінска, за якую выступалі ігракі вышэйшай лігі СССР — каманды РТІ, вырашыла лёс залатых узнагарод. Першая палова — за гамяльчанамі, яны вядуць 57:46. У другой палове — становішча выраўнялася, хаця за тры мінуты да заканчэння матча нашы баскетбалісты яшчэ лідзіруюць — 97:93. Аднак канцоўка матча праходзіла для нашай каманды драматычна, і яна ўступае 6 ачкоў. Канчатковы вынік — 107:101 на карысць мінчан. Такім чынам, вышэйшыя ўзнагароды спартакіяды дасталіся баскетбалістам беларускай сталіцы, сярэбраныя медалі ў нашых рабят.

У заключэнне зазначу, што за зборную каманду Гомельшчыны на спартакіядзе выступілі два студэнты з фізічнага факультэта нашага універсітэта — Сяргей Пінчук і Аляксандр Соўган і тры — з факультэта фізічнай культуры — Юрый Арлоў, Сяргей Мацыгуд, Сяргей Быхаўцаў.

**В. МАРЧАНКА,**
**наш няштатны карэспандэнт.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины, Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па друку, Гомель, Савецкая,1.**

**Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 1500 экз. Заказ 399. Падпісана да друку ў 17.00.**